# Літаратурна-мастацкая старонка (478)

## На небе Надзеі



Трыццаць год таму Надзеі Артымовіч напісаўся верш. Па асеннім небе скацілася сляза. *Ой, ляцелі гусі...* Гэты верш пачынае новы зборнік, *адплывае спакойнае неба*. А Юрка Туронак зглавіў няўлоўную душу Надзеі ў аб'ектыўны фотааб'ектыў. А Яўген Міранавіч і Алесь Разанаў таксама важнымі словамі запісалі важнае. А неба і краявід душы апусціліся лагодна на вокладку, што ласкава абымае неабдымнае...

**Міра Лукша**

## Выспа Надзеі Артымовіч

Творчасць Надзеі Артымовіч уберагалася ад інерцыі, уласцівай айчыннаму вершаскладанню; яна піша вершы не таму, што ўмее пісаць, а таму, што, па сутнасці, яны ўжо напісаны, і напісаны самой сутнасцю: яна дае ім выявіцца, вымавіцца, вымалявацца, вытлумачыцца, зрабіцца прысутнымі, і калі гэта здараецца, то ў Бельску грае „старая музыка”, а ў свеце дзейсніцца свята, у якое прысвячаемся і мы.

Сваімі „кароткімі” вершамі яна закранае, асягае, урэчаісніваe тое нешта, што не мае наймення і што ў прадмеце праяўляецца як прыкмета, у назоўніку як прыкметнік і найменнем яму становіцца сам верш.

У падаснове яе твораў угадваецца сістэма, і тыя настойлівыя лічэбнікі, якія раз-пораз аб'яўляюцца ў яе вершах, ускоснае пацвярджэнне гэтаму.

Учытваючыся ў вершы Надзеі Артымовіч, прыходзіш да інтуітыўнай высновы пра таемную роднасць мастацтва і навукі, паэзіі і матэматыкі, да адчування, што паэзія — сколак ці галіна нейкай старажытнай веды, калі рэчаіснасць мысліласся і спасцігалася інакш, чым цяпер, і была (а можа, насампраўды ёсць і цяпер) інакшай.

Ёсць паэты, у творчасці якіх за вершамі не відаць паэзіі. У творчасці Надзеі Артымовіч, наадварот, увесь час заяўляе аб сабе істота паэзіі.

Яе вершы тым і таму істотныя: за іхняй вонкавай несамавітасцю тоіцца глыбіня невымоўнасці, якая, аднак, углядаецца ў нас знаёмымі вобразамі і прамаўляе знаёмымі галасамі. І, можа, урэшце, якраз таму, што вобразы і галасы вынікаюць з глыбіні невымоўнасці, яны аказваюцца знаёмымі.

У сплытчэлым і спрасцелым свеце ўсё больш выказанага і ўсё менш месца для выказвання. Гэтае месца амаль што ўжо выспа.

З „горлам, падстаўленым пад вецер”, безабаронным і гатовым вымавіць слова, якое само захоча вымавіцца (і таму менавіта горла), Надзея Артымовіч скіроўваецца на сваю, збераженую ёю ад наступу сушы, выспу.

**Алесь Разанаў**




## Ад рэдактара кнігі

Мінае 30 гадоў з таго часу, калі на старонках „Нівы” паказаўся першы верш Надзеі Артымовіч. Пасля былі іншыя вершы і зборнікі, якія выклікалі шчырае зацікаўленне не толькі беларускага літаратурнага асяроддзя. Іх аўтарка ніколі не падпарадкоўвалася ўплывам ні палітычнай, ні ідэалагічнай, ні культурнай кан'юнктуры. У яе творчай спадчыне няма вершаў пісаных дзеля чагосьці. Ёсць затое вельмі ўнутранае адчуванне свету. Часам гэта адлюстраваны словамі стан падсвядомасці аўтаркі. Напісаныя ў сямідзесятыя гады вершы як бы расказваюць пра ўражанні, пачуцці сённяшняга дня. Ёсць у паэзіі Надзі Артымовіч нейкі універсалізм, які кранае чалавечую экзістэнцыю. Кожны часам мае сон, які не дае яму спакою, пытанні, на якія не знаходзіць адказаў і цень другога чалавека, які цягнецца за ім.

Надзея Артымовіч ніколі не дбала пра рэкламу свае паэзіі, не пераўтварала яе ў тавар, захоўвала вернасць запісаным словам. Час — найбольш справядлівы суддзя місіі кожнага чалавека. Думаю, што Надзея Артымовіч можа спакойна чакаць яго ацэнкі.

**Яўген Міранович**

## Фрэйдаўскі „Рытуал” між хмызоў і балотаў




У верасні наймалодшаму тэвэлаўцу Юры Гуменюку споўнілася 30 гадоў. З гэтае нагоды ў серыі „Бібліятэка часопіса «Калосьсе»” выйшла трэцяя кніга экстравагантнага гродзенца „Рытуал”. Зборнік быў падрыхтаваны яшчэ ў 1997 годзе, меркавалася, што ён выйдзе ў Варшаве. Аднак „Рытуалу”, як і двум папярэднім кнігам паэта „Водар цела” і „Твар Тутанхамона”, лёсіла пабачыць свет у Полацку. Гумянюк застаўся адзіным тэвэлаўцам, у паэтычную творчасць якога дзяржава практычна не інвеставала грошы. (Праўда, дзяржаўнай кнігі няма і ў Ігара Сідарука, але ён як драматург прысутнічае ў некалькіх калектыўных.) Дзяржкамдрукаўская і мінкультаўская няўвага не замінулі Гуменюку стацца добра вядомым у Беларусі. Яго чыталі, цытавалі, завучвалі на памяць ад Гомеля да Паставаў. Навапалацкі рок-гурт „Грунвальд” запісаў альбом „Старыя назовы”, у якім палову песень на словы Гуменюка (прычым, сам Юры і духам не ведаў пра такую творчую супрацу). Патрапіў ён і ў вядомую, складзеную Янам Максімюком, анталогію новай беларускай паэзіі „Za niebokresem Europy”, што выйшла па-польску ў Беластоку ў 1998 годзе. У зборніку нават аказаўся верш „Sperma prezydenta” (пераклад Аліны Ваўранюк), які да гэтага хадзіў у рукапісе. Вядома, слава Гуменюка найперш скандальная, але і такую набыць ой як не проста.

У трэцюю кнігу паэта патрапілі вершы, напісаны ў 1995-1999 гадах. Большасць з іх чытач ведае па публікацыях у „Калоссі”, „Крыніцы”, „Пагоні”. Сярод „рытуальных” тэкстаў такія хіты як „Вібрацыя твані”, „Рэфлексыя”, „Ёкагама”, „Цыяністы сьнег”, „Сьвятарная карова”, раней узгаданы „SP” ды іншыя. У нейкім сэнсе кніга крыху састарэла. Не, не самі вершы, яны як раз вытрымалі выпрабаванне часу. Састарэў дух самой кнігі: нігілістычна-песімістычна-брутальны. Жыццё наша зараз так імкліва ляціць наперад, што тры гады затрымкі — вельмі вялікі перыяд, за які адбываецца шмат і адбываецца сутнасна. Мяняюцца акцэнты, дамінанты, эстэтычныя запатрабаванні. Істотна хаця б тое, што за гэты час тэвэлаўцы канчаткова развіталіся з юначым узростам. (Старэйшаму, Вінцэсю Мудрову, летась споўнілася 45.) Увогуле ў гэтых імклівых пераменах палягае вялікая праблема Гуменюка. Узрост патрабуе іншага творчага чыну.

„Рытуал”, аднак, пры ўсіх хібах застаецца адметнай з'явай. Ягоная гуллівая саркастычнасць, за якую хаваецца Гумянюк, — сапраўдная, сублімацыйная. Паэт не прыдумляе, пра што б гэта яму напісаць? — а шчыра, па-дзіцячы смела, дэкламуе перад дарослымі. Часам сам не разумее сваіх адкрыццяў і глыбіняў. На тое ён і паэт — дзіця жыццёвых стыхіяў. Часам ягоны гнеў наіўны, увага да сябе нарцыстычная, а звароты да чытача пафасна ўзнёслыя. „Пабудзь ахвярай Ераніма Босха! Ён не прасіў цябе, але пабудзь”, — просіць паэт. І ты сапраўды адчуваеш між радкоў боскаўскую квінтэсенцыю пекла, болю і безвыходнасці. Кнігі Гуменюка нагадваюць фільмы серыяла. Іх трэба выдаваць штогод, каб чытач не губляў канву сюжэта. Бо чалавечы лёс, пра які прамаўляецца шчыра, выклікае вялікую цікавасць у людзей. Як мексіканскія тэлесерыялы, як жыццё прынцэсы Дыяны. У тых аповедах шмат пачуццяў, жарсці, пацалункаў, здрадаў.

„Рытуалам” Гумянюк умацаваў сваю скандальную вядомасць. Нават Адамовіч так жорстка не выказваўся.

*Як жыць далей? Сьвіньня нябёсная*
*ня скажа,*
*Раскрые анус — пацячэ лайно.*
*А мы падманутыя ў жыжцы*
*плазам ляжам,*
*Бо шчасьця і дагэтуль не відно.*

**Алесь Аркуш**

*Міра Лукша*

* * *

*Чалавеку, які*
*зазірнуў за край*
*непазнавальнага,*
*не вярнуцца*
*адтуль аніколі.*

*Марыля Базылюк*

* * *

*потым*
*адвядзеш мяне*
*на маё месца*
*каб перакананца*
*што спазнілася на той час*

*а можа*
*ў начы*
*не закрые вачэй чаканне*

*Барыс Руско*

### Малітва

*Госпадзі! Ляпіў Ты свет з сырца,*
*які меў пад рукою.*
*Відаць, не было лепшай гліны.*
*І не на тое даў Ты чалавеку*
*волю вольную,*
*каб ён спапяліў свой дом*
*і ўсё, што на зямлі.*
*Ты даў якую волю,*
*каб ён Тварэнне Тваё*
*удасканальваў —*
*на славу жыцця,*
*у якім гарыць агонь святы*
*Тваёй свядомасці.*
*Госпадзі! На дрэве Тварэння*
*Твайго чалавек —*
*ветка заўчасная.*
*Глянь на ўчынкі яго*
*і злітуйся над ім,*
*дазволь выпіць чару*
*з мора Твайго розуму*
*і адкрыць вочы і сэрца,*
*і ўбачыць у любові*
*святло Тваёй задумы.*